# 1 СЕМЕСТР

1. **Ab aqua silente cave**. – Сцеражыся ціхай вады.
2. **Auro quaque janua pandĭtur**. – Любыя дзверы адчыняюцца золатам.
3. **Cuilĭbet fatuo placet sua clava**. – Кожнаму дурню свой кій падабаецца
4. **Ex lingua stulta veniunt incommŏda multa**. – Ад неразумнага языка прыходзіць шмат бедаў.
5. **Fumum patĭmur propter ignem**. – Мы церпім дым з-за агню.
6. **In nocte consilium**. – Рашэнне прыходзіць ноччу (пар. Пераначуем, то болей пачуем).
7. **Lucri bonus est odor ex re qualĭbet**. – Пах прыбытку прыемны, ад чаго б ён ні зыходзіў.
8. **Mare verborum, gutta rerum**. – Мора слоў – кропля спраў.
9. **Nemo sine vitiis nascĭtur**. – Ніхто не нараджаецца без заганаў.
10. **Pecuniae omnia oboediunt**. – Грошам усё скараецца.
11. **Amīcus certus in re incerta cernĭtur**. – Верны сябар пазнаецца ў бядзе.
12. **Aut Caesar, aut nihil**. – Альбо Цэзар, альбо нішто.
13. **Cujus regio, ejus lingua**. – Чыя краіна, таго і мова.
14. **Ferrum natāre doces**. – Ты вучыш жалеза плаваць.
15. **Gaudia principium nostri sunt saepe dolōris**. – Радасць часта з’яўляецца пачаткам нашага гора.
16. **Inŏpi beneficium bis dat, qui dat celerĭter**. – Беднаму ўдвайне робіць дабрадзейства той, хто робіць гэта хутка.
17. **Lupi fauci manum ne committe**. – Не кладзі руку ў пашчу ваўку.
18. **Melior est canis vivus leōne mortuo**. – Жывы сабака лепш за мёртвага льва.
19. **Ne quid nimis**. – Нічога лішняга / празмерна.
20. **Per fas ac nefas**. – Дазволенымі і недазволенымі сродкамі.
21. **Arbor e fructu cognoscĭtur**. – Дрэва пазнаю́ць па плодзе.
22. **Aut vincĕre, aut mori**. – Альбо перамагчы, альбо памерці.
23. **De gustĭbus et colorĭbus non est disputandum**. – Пра густы і колер не варта спрачацца.
24. **Festīna lente**. – Спяшайся павольна.
25. **Gratia parit gratiam**. – Удзячнасць спараджае ўдзячнасць.
26. **In quo nascētur asĭnus corio, moriētur**. – У якой шкуры асёл народзіцца, у такой і памрэ.
27. **Lupus pilum mutat, non mentem**. – Воўк мяняе шкуру, але не нораў.
28. **Melior tutiorque est certa pax, quam sperāta victoria**. – Лепш і надзейней пэўны мір, чым чаканая перамога.
29. **Nescit vox missa reverti**. – Прамоўленае слова нельга вярнуць.
30. **Prudentia saepe vitantur pericŭla**. – Дзякуючы разважлівасці мы часта пазбягаем небяспекі.
31. **Arbor mala, mala mala**. – Благая яблыня – благія яблыкі.
32. **Caecus non judĭcat de colōre**. – Сляпы не судзіць пра колер.
33. **Dimidium facti, qui coepit, facit**. – Хто пачаў, той зрабіў палову справы.
34. **Finis corōnat opus**. – Канец вянчае справу.
35. **Homo homĭni lupus est**. – Чалавек чалавеку воўк.
36. **In silvam ligna ferre**. – Насіць дровы ў лес.
37. **Mala herba cito crescit**. – Дрэнная трава хутка расце.
38. **Melius aliquid quam nihil**. – Лепш што-небудзь, чым нічога.
39. **Nihil est annis velocius**. – Няма нічога больш хуткага, чым бег гадоў.
40. **Quae nocent, docent**. – Што шкодзіць, тое вучыць.